PolotskSU

Министерство образования Республики Беларусь

Учреждение образования
Полоцкий государственный университет

# НОВЫЕ КОММУНИКАТИВНЫЕ ТЕХНОЛОГИИ И СОВРЕМЕННОЕ БЕЛОРУССКОЕ ОБЩЕСТВО

Электронный сборник статей
Международной научной конференции

(Новополоцк, 11-12 ноября 2016 г.)

Под общей редакцией
И.А. Бортника

Новополоцк
2017

PolotskSU

Все права на размножение и распространение в любой форме остаются за УО «Полоцкий государственный университет».

Нелегальное копирование и использование данного продукта запрещены.

**Новые коммуникативные технологии и современное белорусское общество** : электрон. сб. ст. Междунар. науч. конф, Новополоцк, 11–12 нояб. 2016 г. / Полоц. гос. ун-т ; под общ. ред. И.А. Бортника. – Новополоцк : Полоцкий государственный университет, 2017. – 1 CD-ROM.

211440, ул. Блохина, 29,
г. Новополоцк
Тел.: 59-37-39, 39-40-46
http://www.psu.by

Компьютерная верстка: Лазарёнок Егор Юрьевич
Программное обеспечение: Мядиль Анна Николаевна
Компьютерный дизайн: Мухоморова Мария Сергеевна

№ госрегистрации 3021713593

© Бортник И.А.., 2017
© Полоцкий государственный университет, 2017

PolotskSU

# Выхад сеткавага грамадства ў афлайн

**Крывалап А.Д.**, кандыдат культуралогіі,
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Наваполацк

Чым для нас сёння з'яўляецца сеткавае грамадства? З аднаго боку, калі мы актыўна карыстаемся інтэрнэтам, то амаль што аўтаматычна далучаемся да сеткавага грамадства, а з іншага – тэорыя сеткавага грамадства патрабуе дадатковых тлумачэнняў, каб зразумець што адбываецца сёння ў нашым грамадстве. Я. Ван Дэйк напісаў у 1991 годзе кнігу «Сеткавае грамадства», якая была надрукавана на галандскай мове і пазней была перакладзена на англійскую. Значна больш добра вядомы тэкст Мануэля Кастэльса «Галактыка Інтэрнэт» убачыла свет у 2001 годзе. Паміж імі дзесяць год розніцы, але ж яны акцэнтуюць увагу на падобных праблемах і выкліках, якія суправаджаюць пабудову сеткавага грамадства. Наша задача зразумець як успрымаецца сеткавае грамадства Я. Ван Дэйкам і М. Кастэльсам, а таксама наколькі гэтыя тэорыя актуальны для беларускага грамадства.

Сацыяльныя сеткі былі і да інтэрнэту, але ж сеткавае грамадства будуецца не толькі і не столькі як сетка сацыяльных сувязей, колькі як сетка распаўсюду інфармацыі. «З невялікім перабольшаннем, мы можам назваць XIX стагоддзе эрай сетак. Сеткі становяцца нервовай сістэмай нашага грамадства, і мы можам чакаць, што гэтая інфраструктура, будзе мець большы ўплыў на ўсё наша сацыяльнае і прыватнае жыццё, чым у свой час паўплывала будаўніцтва дарог для перавозкі грузаў і людзей. У гэтым сэнсе "інфармацыйныя магістралі" з'яўляюцца прыдатным тэрмінам» [4, с. 2].

Дарэчы, гэта метафара хуткасных шасэ ў дачыненні да інфармацыйных тэхналогій не выпадковая. Так у кнізе Дж. Андэрсан «Уяўляючы інтэрнэт» адведзены асобны раздзел пытанню гісторыі з'яўлення гэтай метафары, калі «Магчыма разглядаць камп'ютар як эквівалент аўтамабіля, а інтэрнэт як сістэму шашы» [1, с. 77].

Але ж вернемся да сеткавага грамадства. Ці актуальна сёння для Беларусі пытанне існавання сеткавай культуры і сеткавага грамадства? Калі ў нас больш за 5 млн. чалавек карыстаецца інтэрнэтам і прыблізна столькі ж не карыстаецца. Зразумела, што сеткавае грамадства не ўзнікае аднекуль імгненна, а яго стварэнне патрабуе пэўны час. Фактычны мы ўжо зараз можам назіраць за паступовымі зменамі ў некаторых аспектах сацыяльнага жыцця. Калі штодзённая практыка анлайн-камунікацыі ўплывае на нашы паводзіны і ў афлайне. Напэўна, самым відавочным тут будзе ўплыў на мову. Калі мы не ўсведамляючы гэты працэс пачынаем пераасэнсоўваць базавыя рэчы і паняткі. Так віртуальны friend не

PolotskSU

абавязкова сапраўдны сябар, community не ёсць супольнасць. Праз змену сэнсу знакаў, змяняецца і сэнс нашых рэальных дзеянняў, якія адбываюцца па-за межамі віртуальнай прасторы.

Гэты працэс станаўлення сеткавага грамадства, на думку Я. ван Дэйка, адбываецца праз шэраг камунікатыўных рэвалюцый, якія дазваляюць па-іншаму разглядаць пытанне прасторы і часу. Першая камунікатыўная рэвалюцыя імкнулася вырашыць праблему з фіксаванага прасторай і часам чалавечага жыцця тут і зараз: з дапамогай дыму перадаваліся пажарныя сігналы на вялікую адлегласць, што вырашала пытанне прасторы. Ці малюнкі на сценах пячоры ператвараліся ў паведамленні будучым генерацыям, якія анігілявалі праблему часу. Другая камунікатыўная рэвалюцыя – з'яўленне пісьменства, дазволіла людзям пераадолець прастору і час адначасова. Трэцяя, (і напэўна не апошняя) – структурная рэвалюцыя. Па меркаванню Я. ван Дэйка гэта сведчыць пра тое, што больш не мае сэнсу дзяліць медыя на тыя, што вырашаюць пытанне часу і тыя што звязаны з пытаннем прасторы. «Новыя медыя, у рэшце рэшт, могуць быць выкарыстаны для абедзвюх мэтаў. Нават пры тым, што мэта пераадолення часу і прасторы, пераважае, новыя медыя таксама могуць быць выкарыстаны ў аўтаномнай асяроддзі»[4, с. 4]. Такім чынам «сутнасць цяперашняй рэвалюцыі можна падсумаваць тэрмінамі: лічбавы код, інтэграцыя і інтэрактыўнасць, як вызначальныя характарыстыкі новых сродкаў масавай інфармацыі». [4, с. 6].

І гэта дае магчымасць звярнуцца да вызначэння таго, што такое сеткавае грамадства? «Канцэпцыя сеткавага грамадства падкрэслівае форму і арганізацыю апрацоўкі і абмену інфармацыяй, таксама гэта вызначае і інфраструктура сацыяльных і медыя-сетак. Такім чынам, сеткавае грамадства можа быць вызначана як сацыяльная фармацыя ў якой інфраструктура сацыяльных і медыя-сетак, у прыярытэтным рэжыме будзе мець арганізацыйны уплыў на ўсіх узроўнях (індывідуальным, групавым / арганізацыйным і грамадскім)» [4, с. 20].

Грамадства пераасэнсоўваецца не як статычныя дыспазіцыі і кропкі назірання і дэманстрацыі, колькі як супольнасць уплывовых камунікатыўных адзінак. Каштоўнасць сеціва грунтуецца на функцыянальнай дзеяздольнасці. Калі мы дзейнічаем як рэтраслятары, то не мае значэння, што мы перадаём, істотна, што мы падтрымліваем камунікацыю. Лідары думак і блогеры-тысячнікі – вось яны (як перадатчыкі) і з'яўляюцца інфраструктурай сеткавага грамадства.

Пытанне стварэння зместу паведамленняў не разглядаецца, галоўная каштоўнасць – перадаваць атрыманую інфармацыю. «Сутнасць сродкаў масавай інфармацыі, такім чынам, наступная: іх функцыя складаецца ў нейтралізацыі жывога, унікальнага, падзейнага характару свету, у замене разнастайнага сусвету сродкамі інфармацыі, ў якасці гамагенных адзін

PolotskSU

аднаму, якія абазначаюць адзін аднаго і адсылаюць ад аднаго да іншага. У крайнім выпадку яны робяцца ўзаемным зместам адным аднаго – і ў гэтым таталітарнае «пасланне» грамадства спажывання» [2, с. 160]. Потым гэтую з'яву Ж. Бадрыйяр назаве сімуляцыяй, скіраванай на стварэнне сімулякраў.

М. Кастэльс прадбачыць шмат выклікаў існаванню сеткавага грамадства, але ж падрабязна спыняецца на трох асноўных: сама свабода як з'ява, выключэнне з сетак камунікацыі і індывідуалізацыя праблемы навучання (інтэлектуальнай здольнасці вучыцца), якой не адпавядаюць наяўныя сістэмы адукацыі [3, с. 277]. Мы засяродзім сваю ўвагу на другім выкліку, бо ён падаецца прынцыповым.

Калі Я. ван Дэйк падрабязна спыняецца на канцэпцыі лічбавай няроўнасці (Digital Divide) якая існуе як паміж рознымі грамадствамі, так і ўнутры асобнага грамадства. То М. Кастэльс падкрэслівае, што ўплыў інтэрнэту на грамадства выходзіць далёка за межы сталых карыстальнікаў. «Асноўныя эканамічныя, сацыяльныя, палітычныя і культурныя актыўнасці па ўсёй планеце ў цяперашні час структураваны і адбываюцца вакол інтэрнэту і іншых кампутарных сетак. На самай справе, выключэньне з гэтых сетак з'яўляецца адным з найбольш разбуральных формаў адчужэння ў нашай эканоміцы і ў нашай культуры» [3, с. 3].

Іншымі словамі, практыкі выключэння з камунікацыі – гэта адна з самых жахлівых рэчаў, якія могуць адбыцца ў развіцці грамадства. І пры пабудове сеткавага грамадства прынцыпова важна захаваць і нават дадаткова стымуляваць далучанасць да гэтага працэсу карыстальнікаў на розных узроўнях. Калі паказчыкам развіцця сеткавага грамадства з'яўляецца колькасць інтэрнэт-карыстальнікаў, то гэта адзін узровень разумення тэорыі. І зусім іншы ўзровень, калі мы імкнёмся на пашырэння інклюзіўнасці шэраговых прадстаўнікоў у гэты агульны працэс.

Адзін прыклад з беларускай практыкі, як развіццё і ўдасканальванне тэхналогій пакідае свой адбітак на грамадстве. З першага кастрычніка 2016 года ў Беларусі спыніла сваю працу радыёвяшчанне па правадной сетцы. Радыёкропкі змоўклі назаўсёды. Слухачам было прапанавана слухаць гэты ж самы радыёканал ў іншым дыяпазоне, ці нават глядзець і слухаць праз анлайн трансляцыі ў інтэрнэце. Але ж ці набліжае нас гэта да пабудовы сеткавага грамадства? Ці патрапяць людзі, якія слухалі радыёкропку ў інтэрнэт, каб і далей слухаць тыя ж самыя каналы? Ці будуць яны адчуваць сваю прыналежнасць і запатрабаванасць?

А завершыць гэты тэкст хацелася б выказваннем М. Кастэльса: «Калі вы не клапоціцеся пра сеткі, сеткі будуць клапаціцца пра вас, ва ўсялякім выпадку. Да таго часу, як вы маеце намер жыць у грамадстве, у гэты ж самы час і ў гэтым месцы, вы будзеце мець справу з сеткавым грамадствам. Таму што мы жывем у Інтэрнэт Галактыке». [3, с. 282].

PolotskSU

ЛІТАРАТУРА
1. Anderson, J.Q. Imagining the internet: personalities, predictions, perspectives / J.Q. Anderson. – Lanham, Md: Rowman & Littlefield, 2005. – 322 с.
2. Бодрийяр, Ж. Общество потребления. Его мифы и структуры / Ж. Бодрийяр. – Москва: Республика; Культурная революция, 2006. – 269 с.
3. Castells, M. The Internet galaxy: reflections on the Internet, business, and society / M. Castells. – Oxford; New York: Oxford University Press, 2001. – 292 с.
4. Van Dijk, Jan A.G.M. The Network Society. Social Aspects of New Media. Second edition / Jan A.G.M. van Dijk. – London, Thousand Oaks, New Delhi: SAGE, 2006. – 292 p.